Н. В. Кухарев (отв. ред.); М-во образования РБ, ГУО «ГОИРО». – Гомель : ГУО «ГОИРО», 2009. – Вып. 11, ч. 4. – С. 44–47.

2. Старченко, В. Н. Методологические аспекты педагогического контроля знаний / В. Н. Старченко // Актуальные вопросы научно-методической и учебно-организационной работы: Модернизация высшего образования как определяющий фактор развития Университета / Материалы научно-методической конференции (Гомель, 14–15 марта 2013 года) В четырех частях, Часть 1, Гомель, ГГУ им. Ф. Скорины 2013. – С. 162–165.

**УДК 796.57:797.1(476.2)»19/20»**

***А. С. Калугіна***

## РАЗВІЦЦЁ ВОДНАГА ТУРЫЗМА НА ПАЛЕССІ Ў КАНЦЫ XX – ПАЧАТКУ XXI ст.

*Артыкул прысвечаны разгляду сучаснага стану развіцця воднага турызма на тэрыторыі беларускага Палесся. У рабоце прадстаўлены актуальныя водныя турыстычныя маршруты рэгёна і агляд турыстычных арганізацый, якія прапаноўваюць водныя туры і экскурсіі па Палессі. Вялікая ўвага надаецца асаблівасцям развіцця накірункаў воднага турызма ў пачатку XXI ст.*

Водны турызм з’яўляецца адным з самых папулярных кірункаў актыўнага адпачынку ў Беларусі. Найбольш папулярнымі відамі такога турызма з’яўляюцца: сплавы на байдарках, водныя экскурсіі на паромах і кацерах, а таксама змешаныя маршруты. Галоўныя рэкі Палесся: Прыпяць, Днепр, Дзісна, з вялікай колькасцю прытокаў, прадстаўляюць добрыя і зручныя магчымасці знаёмства з рэгіёнам па водным шляхам.

У 1990-я гг. XX ст. актуальнымі былі водныя паходы на байдарках, сплавы на каноэ. У гэты час водны турызм характарызаваўся спартыўнай і аздараўленчай накіраванасцю і меў аматарскі характар. Асноўныя водныя маршруты былі прадстаўлены сплавамі па рэкам Сож, Прыпяць і іх прытокам.

На пачатку XXI ст. турызм пачаў разглядацца як важная частка эканомікі, а таксама спосаб пашырэння знаёмства з беларускай культурай і гісторыяй. У гэты час пачалі развівацца як класічныя віды і напрамкі турызма ў Беларусі, так і з’яўляцца новыя, накіраваныя не толькі на актыўны адпачынак, але і на знаёмства з гісторыяй і культурай Палесся. Гэта абумоўлена ростам прыватных арганізацый, якія актуалізуюць водны турызм і пашыраюць турыстычныя паслугі.

Актыўным развіццём турызма на Прыпяці займаецца Нацыянальны парк Прыпяцкі, які прапаноўвае турыстам водныя экскурсіі па рацэ. Арганізацыя дае магчымасць арандаваць 3 цеплахода: «Кірыла Тураўскі», «Зубр» і «Лось», кожны агульнай умяшчальнасцю да 40 чалавек, да цеплахода можна далучыць баржу, здольную прыняць да 200 чалавек. Асноўны напрамак маршрута – уніз па рацэ Прыпяць. Арганізацыя таксама прапоноўвае турыстам пракат маторных судоў, вёсельных лодак і байдарак для самастойных сплаваў, а таксама, пры неабходнасці, прадастаўляе інструктара [1, ст. 469].

Наступная турыстычная арганізацыя, што прапаноўвае водныя экскурсіі па Прыпяць – кампанія «Белагратур». Арганізацыя прадстаўляе тур Тураў – Нацыянальны парк «Прыпяцкі» – вандроўку на цеплаходзе па рацэ Прыпяць», а таксама размяшчэнне ў плавучай гасцініцы «Палессе». Яшчэ адзін водны маршрут турфірмы – рачны круіз

Тураў – Вільча – Тураў. Названыя вышэй туры прадстаўляюць экскурсію па аднаму са старэйшых усходнеславянскіх гарадоў – Тураву.

У Тураве турыстам прапаноўваецца наведаць краязнаўчы музей. Цэнтральным экспанатам гісторыка-археалагічнага комплексу «Старажытны Тураў» з'яўляецца падмурак цаглянога храма 12 ст. [2, ст. 210].

Экскурсійны маршрут «Падарожжа ў Палескую Амазонію», распрацаваны дэпартаментам па турызму Міністэрства спорту і турызму Беларусі. Воднае падарожжа праходзіць па рацэ Прыпяць ад Пінска да Турава і злучае дзве старажытныя сталіцы Палесся. Падчас праходжання маршрута прадастаўляецца магчымасць наведаць ландшафтны заказнік «Сярэдняя Прыпяць» і пабываць у самабытных палескіх вёсках. Дапаўняе экскурсійную праграму наведванне аднаго з самых старажытных беларускіх гарадоў – Пінска.

Значную ролю ў развіцці воднага турызма ў рэгіёне прыпяцкага Палесся адыгрывае аграсядзіба «Прыпяцкі плёс». Арганізацыя прапаноўвае разнастайныя водныя і пешыя турыстычныя маршруты, распрацаваныя як для дзяцей, так і для дарослых. Шырока падстаўлены сплавы на байдарках.

Адным з найбольш папулярных маршрутаў з'яўляецца сплаў на байдарках «На прасторах Палесся» па рэках Случ, Прыпяць з наведваннем горада Турава. У Тураве прапоноўваецца наведаць краязнаўчы музей.

Сярод водных турыстычных маршрутаў па беларускім Палессе важнае месца займае рака Ясельда. Падобны маршрут прадстаўлены сплавам на байдарках. Маршрут праходзіць па найпрыгажэйшых і самабытных месцах беларускага Палесся. Гэта дазваляе пазнаёміцца з асаблівасцямі прыроды, краявідамі і пейзажамі.

Унікальнасць маршрута паўстае ў наведванні вёскі Кудрычы. Вёска ўяўляе сабой натуральны музей традыцыйнай палескай культуры пад адкрытым небам. Галоўная вуліца ўяўляе сабой тыповую палескую вёску з пакрытымі чаротам хатамі. Да нашых дзён тут захаваліся асаблівасці традыцыйнага побыту палешукоў. Кудрычы з'яўляюцца захавальнікамі традыцыйнага беларускага промысла – бортніцтва.

Водны турызм Гомеля прадстаўлены шэрагам маршрутаў. Адзін з самых папулярных – «Сож – блакітная артэрыя Гомеля». Экскурсійны маршрут прадстаўляе вандроўку на цеплаходзе, падчас якой турысты знаёмяцца гісторыяй Гомеля, маюць магчымасць ўбачаць панараму архітэктурных помнікаў горада.

Змешаныя турыстычныя маршруты прадстаўлены пешаходна-водным паходам «Чар Палесся». Першая частка шляху пераадольваецца пешшу, адругая – на байдарках. Пачатак маршрута з'яўляецца пешым чатырохдзённым паходам праз Альманскія балоты – найбуйнейшае і самае прыгожае балота Еўропы, што працягнулася з захаду на ўсход амаль на 80 кіламетраў. Другая частка маршруту – шасцідзённы сплаў па рацэ Сцвіга, якая радуе турыстаў чыстай вадой і непаўторнымі палескімі краявідамі.

Важнае месца ў водным турызме займае дзіцячы і сямейны экатурызм. Кожнае лета, на базе аграсядзібы «Прыпяцкі плёс» у вёсцы Лахаўка Лунінецкага раёна, ладзіцца Экалагічны намётавы лагер «Палескія рабінзоны». У праграму ўключаны: двухдзённы сплаў на байдарках па Прыпяці, а таксама экалагічная пешая экскурсія ў заказнік «Сярэдняя Прыпяць». Дадзеныя мерапрыемства дазваляюць пашырыць сямейную турыстычную актыўнасць, а таксама прыцягнуць увагу ўдзельнікаў да спартыўнага турызма. Намётавы лагер «Палескія рабінзоны» праводзіць актыўную працу па экалагічнаму выхаванню дзяцей [3].

Пэўную ролю ў развіцці і папулярызацыі воднага турызма займаюць грэбныя базы і лодачныя станцыі. Прыкладамі могуць служыць грэбная база «Воднік» у Гомелі, грэбная база № 1 на базе Палескага дзяржаўнага ўніверсітэта ў Пінску, лодачныя станцыі ў Ляскавічах, Мозыры, Тураве, Гомелі, Пінску.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Такім чынам, рэгіён Прыпяцкага Палесся паўстае як перспектыўны накірунак развіцця воднага турызму. Турыстычныя магчымасці рэгіёна шырока прадстаўлены ў турыстычных арганізацыях, але маюцца таксама перспектыўныя турыстычныя накірункі і аб'екты гісторыка-культурнай спадчыны недастаткова асвечаныя ў водных турыстычных маршрутах. Прыкладамі такіх аб'ектаў могуць служыць Кобрын, Нароўля, Кажан-гарадок, Давыд-гарадок, а таксама самабытныя палескія вёскі.

Дзякуючы значнай колькасці водных шляхоў, захаванню матэрыяльнай гісторыка-культурнай спадчыны, культурна-этнічным асаблівасцям рэгіёна, тэрыторыя беларускага Палесся прадастаўляе шырокія магчымасці для пашырэння турыстычнай актыўнасці ў рэгіёне. Унікальная прырода Палесся стварае спрыяльныя ўмовы для развіцця экалагічнага турызму. Дзякуючы наяўнасці шырокай сеткі водных маршрутаў Палессе з'яўляецца перспектыўным накірункам для развіцця воднага турызма.

**Літаратура**


1 Туристская энциклопедия Беларуси / Редкал.:Пирожник И. И. [и др.] – Мн.: белэн, 2007 г.

2 Тураўскі краязнаўчы музей // Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі. – Мн., 1987. – Т. 5. – 289 с.

3 Турыстычная арганізацыя «Прыпяцкі плёс» [Электронны рэсурс] – Рэжым доступа: http://baida.by/# // Дата доступа 27.02.2015 г.



**УДК 327 (479.224)**



***Е. А. Капба***


## ГОСУДАРСТВООБРАЗУЮЩИЕ ПРОЦЕССЫ В АБХАЗИИ ПОСЛЕ ВОЙНЫ 1993–1994 гг.


*В статье анализируется состояние абхазской государственности на современном этапе, рассматриваются три ветви власти- законодательная, исполнительная и судебная. Внимание уделено экономике и перспективам сотрудничества с Российской Федерацией.*


26 ноября 1994 г. Парламент республики принял новую Конституцию суверенного государства. Государственным языком Республики Абхазия признан абхазский, а языком государственных и других учреждений наряду с абхазским является русский. Государственная власть осуществляется на основе разделения на законодательную, исполнительную и судебную ветви [1]. Абхазия – президентская республика со своими атрибутами государственности (Герб, Флаг, Гимн). Первым президентом Парламент избрал Владислава Ардзинба. 3 октября 1999 г. по результатам всеобщих выборов В. Г. Ардзинба был переизбран Президентом Республики Абхазия.

В результате проведенного референдума, 12 октября 1999 г. принят Акт о государственной независимости Абхазии с мая – июня 1994 г., благодаря проводимой СНГ и одобренной ООН операции по поддержанию мира прекращен огонь на границе между Абхазией и Грузией. Начался возврат беженцев в пограничный с Грузией Гальский район Абхазии.

С декабря 1994 г. по сентябрь 1999 г. Абхазия и ее народ, подверглись жесточайшей политической, экономической и информационной блокаде. Несмотря на все

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ